# З НОВЫМ ГОДАМ, ДАРАГІЯ СЯБРЫ!




# ГРОДЗЕНСКІ УНІВЕРСІТЭТ

ГАЗЕТА КАЛЕКТЫВУ ГРОДЗЕНСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ Я. КУПАЛЫ

*19 (211) 29 снежня 1993 года*


## Шчасця вам у Новым годзе!

**Новы год заўсёды застаецца тым святам, калі чалавек пераасэнсоўвае сваё жыццё і фарміруе сваю ўнутраную праграму абнаўлення.**

**Жадаю кожнаму з вас сфарміравацца ў Новым годзе такімі, каб змаглі ўсё жыццё заставацца шчаслівымі.**

**А дабіцца шчасця без кахання, высокага прафесіяналізма, без інтэлектуальна-эмацыянальнага ўдасканалення, без дабраты і шчодрасці душы немагчыма.**

**Таму жадаю Вам у перыяд вучобы і працы ва універсітэце цвёрда памятаць, што шчасце — рэч самаробная.**

**З павагай — А. БАДАКОЎ,**
**рэктар універсітэта, прафесар, заслужаны работнік вышэйшай школы.**

## Галоўнае — не губляць веры ў сябе

Для мяне асабіста год адыходзячы быў нядрэнным. Стараўся добра вучыцца, знаёміўся з усім лепшым, што ёсць у матэматычнай навуцы, у эканоміцы, палітыцы.

Маё пажаданне ўсім — пастарацца злучыць у адно незлучаемае, каб была магчымасць у кожнага вучыцца і падтрымліваць сваё матэрыяльнае становішча і заставацца заўсёды чалавекам. Бо не сакрэт, што большасць здольных студэнтаў, якія былі ў нашай групе, з-за бытавых цяжкасцей не маглі ў поўную сілу вучыцца.

Лічу, што наш універсітэт павінен стаць салідным навучальным і навуковым цэнтрам не толькі на рэспубліканскім узроўні, але і ў свеце. Каб застаючыся нацыянальнай гордасцю, ён убіраў і міжнародны вопыт, усё лепшае, што ёсць.

Навагодняга настрою Вам, сябры, усяго найлепшага: здароўя, выканання жаданняў і, галоўнае, не губляць веры ў сябе.

**Аляксандр ГРЫНЬ,**
**студэнт 4 курса матэматычнага факультэта, ленінскі стыпендыят.**

## Мудрасці ўсім і стабільнасці

Развітваючыся з 1993 годам, падводзячы вынікі зробленага, з некаторым задавальненнем падумалася, што нягледзячы на ўсе цяжкасці, ускладненні і неакрэсленасць нашага жыцця для гісторыкаў універсітэта гэты год быў плённы і творчы. У Мінску прайшоў Усебеларускі кангрэс гісторыкаў. Былі вызначаны новыя канцэпцыі і падыходы ў гістарычнай навуцы і гістарычнай адукацыі. Прайшлі міжнародныя канферэнцыі ў Лідзе, Навагрудку, у Гродне «Рым-IV».

Выдадзены новы навучальны дапаможнік па гісторыі Беларусі, падрыхтаваны і выйдуць у бліжэйшы час тэксты лекцый па гісторыі Расіі і гісторыі Беларусі. Выдадзена брашура дацэнта Шведа В. В. «По следам гродненской старины» і інш.

Нашы навукоўцы прыйшлі да высновы, што суверэннай беларускай дзяржаве патрэбна свая самастойная гістарычная навука, аб´ектыўна адлюстроўваючая мінулае, і працуюць у гэтым напрамку. І як вынік гэтага — студэнты ўсіх факультэтаў універсітэта ў гэтым годзе ставяцца лепш да вывучэння гісторыі Беларусі, наогул да беларусізацыі.

Па гараскопу 1994 год — гэта мой год. Таму аптымістычна гляджу наперад. Маю шмат цікавых задумак, звязаных з творчай дзейнасцю, з работай вучэбна-метадычнага аддзела. Спадзяюся, што ў нас хопіць мудрасці, розуму, цярпення і сіл пераадолець цяжкасці на ўзроўні універсітэта і краіны.

Шчасця Вам, здароўя, стабільнасці і добрага Новага года.

**Л. БЯРЭЙШЫК.**
**дацэнт кафедры гісторыі Беларусі.**




## Запрашаем на свята

**Навагоднія падарункі для нашых дзяцей падрыхтавалі Дзед Мароз са Снягуркай, прафсаюз і адміністрацыя. Таму і запрашаюць яны ўсіх дзяцей выкладчыкаў і супрацоўнікаў 30 снежня ў 16 гадзін у актавую залу на навагодні ранішнік.**

**А 29 снежня ў 19 гадзін пачнецца Навагодні вечар. Запрашаем усіх студэнтаў і выкладчыкаў на свята.**

**Плённа папрацавалі ў адыходзячым годзе выкладчыкі кафедры інфарматыкі і вылічальнай тэхнікі. Студэнты атрымалі грунтоўныя веды па выбранай спецыяльнасці, азнаёміліся з навінамі ў інфарматыцы.**

**На здымку: выкладчыкі кафедры Ніна Пятроўна Макарава і Валянцін Міхайлавіч Варанцоў.**

Фота У. САРОКІНА.



## Новым тэхналогіям навучання — новую тэхніку

Больш ста мільёнаў рублёў патраціў універсітэт сёлета на набыццё новага вучэбнага абсталявання, прыбораў і іншай тэхнікі, неабходных для ўдасканалення навучальнага працэсу. Усё шырэй сталі выкарыстоўвацца камп ´ютарная, тэле-, аўдыё- і відэатэхніка. Дастаткова сказаць, што толькі ў бягучым годзе набыта 42 персанальныя камп ´ютары на суму звыш 40 мільёнаў рублёў, а за два апошнія гады іх куплена больш 80, відэамагнітафонаў — 11, магнітафонаў — 21, каляровых тэлевізараў — 38, абсталявана 5 лінгафонных кабінетаў.

Ва універсітэце ёсць 12 дысплейных класаў, абсталяваных самымі сучаснымі камп ´ютарамі імпартнай і айчыннай вытворчасці. Загружанасць гэтых класаў самая высокая, заняткі ў іх праходзяць у дзве змены.

У гэтым годзе універсітэт набыў абсталяванне (мадэмы, камп ´ютарная сетка), што дазволіла стварыць адзіную камп ´ютарную сетку з падключэннем да знешняй інфармацыйнай сеткі. Гэта значна палепшыла якасць навучальнага працэса, спрасціла доступ да інфармацыі праз міжнародную камп ´ютарную сетку як для навучальнага працэсу, так і для функцыянавання розных структур універсітэта. Арганізацыя сетак камп ´ютарных класаў дазваляе знізіць кошт аднаго аснашчанага камп ´ютарамі рабочага месца прыкладна на 35 працэнтаў.

Ствараецца агульнаўніверсітэцкая камп ´ютарная сетка, якая ў перспектыве дазволіць наладзіць безпапяровы абмен інфармацыяй.

Самым сучасным абсталяваннем насычаны кабінет для вывучэння замежнай мовы, створаны ў гэтым годзе і які дазволіць выкарыстоўваць у навучальным працэсе тэле-, аўдыё- і відэатэхніку.

Прадметам асаблівага гонару можна лічыць набыццё для універсітэта камплекта відэаабсталявання коштам звыш 14 мільёнаў рублёў і якое дазволіць здымаць, манціраваць і азвучваць відэафільмы на самым сучасным імпартным абсталяванні. З яго дапамогай ужо створаны і выкарыстоўваюцца ў навучальным працэсе некалькі дзесяткаў вучэбных фільмаў.

Расшыраючы і ўдасканальваючы сродкі сувязі, універсітэт у бягучым годзе набыў тэлефакс «Шарп» і тэлеграфны апарат «Тэлекс Ф 200».

Паляпшэнне матэрыяльнай базы ў значнай ступені стала магчымым дзякуючы сродкам, якія атрыманы ад камерцыйнай дзейнасці.

**А. ПЛЮСНІН,**
**інжынер па забеспячэнню.**

# Навуковыя чытанні

Такія чытанні ў нашым універсітэце сталі традыцыйнымі. Праводзіліся яны ў бягучым годзе ў чацвёрты раз. Цікавасць да гэтага мерапрыемства пераўзыходзіць усе прагнозы.

Калі ў снежні мінулага года мы давалі справаздачу з III чытанняў, звярнуліся да чытачоў з меркаваннем, што хацелася б бачыць чытанні сапраўды міжнароднымі, што больш дакладна будзе фармулявацца навуковая праблематыка. Застаючыся ў межах асноўнай праблемы «Узаемадзеянне нацыянальных культур», яна вызначыла новы яе аспект. Больш разнастайнай меркавалася быць культурная праграма.

Сёлетнія чытанні паказалі, што арганізатары добра да іх падрыхтаваліся. Прыехалі вучоныя не толькі з ВНУ Беларусі, але і Расіі. Размова была надзвычай цікавай і плённай. Вызначыўся і галоўны напрамак чытання: навукоўцамі Гродзенскі універсітэт прызнаны як цэнтр беларускай функцыянальнай лінгвістыкі.

Больш падрабязную інфармацыю аб чытаннях вы зможаце прачытаць у наступным нумары газеты.

**На здымках: у час навуковых чытанняў.**

**Фота У. САРОКІНА.**







# З ПАЗІЦЫЙ АДРАДЖЭННЯ

## Актуальнае інтэрв ´ю



**У гэтым годзе выйшла ў свет кніга дактароў гістарычных навук, прафесараў А. І. Залескага і П. М. Кобрынца пад назвай «Аб нацыянальных адносінах у Савецкай Беларусі». І хоць тыраж кнігі па сучасных мерках не такі ўжо малы, але яна ўжо даўно разышлася. Спектр пытанняў, узнятых аўтарамі, даволі шырокі, актуальны і разглядаецца імі далёка не ў традыцыйным выглядзе. Гэтая кніга, скажам шчыра, выклікала павышаную рэакцыю ў чытачоў. З адным з аўтараў гістарычных нарысаў, загадчыкам кафедры гісторыі славянскіх дзяржаў універсітэта П. М. Кобрынцам мы сустрэліся і правялі грунтоўную гутарку, бадай, па самай на сёння актуальнай праблеме, вылучанай у кнізе пад назвай «Нацыянальная культура і трагедыя беларускай мовы». Змяшчаем некаторыя моманты з гэтага інтэрв ´ю.**

**— Пётр Мікалаевіч, пачаць нашу размову я хацеў бы з пытання: што пакладзена ў аснову даследавання ў плане навуковага і метадычнага парадку?**

— Амаль уся гісторыя савецкага перыяду, у тым ліку і гісторыя Беларусі, больш ці менш фальсіфікавана. У аснову свайго даследавання мы ставілі мэту барацьбы за аб ´ектыўнасць гістарычнай навукі, за праўдзівае асвятленне вылучаных у кніжцы пытанняў. Таму дзеля гэтага ў нас многа разважанняў супраць фальсіфікацыі гісторыі. Наша пазіцыя — гэта пазіцыя разумення гісторыі, ацэнкі гістарычных падзей з улікам іх прагрэсіўнасці, або рэакцыйнага характару ў сувязі з асноўнай, вызначальнай тэндэнцыяй гістарычнага працэсу.

**— А цяпер канкрэтна па вылучанаму пытанню. У пачатку шостай главы даследавання вы адзначаеце дасягненні Беларусі ў сацыяльна-эканамічным, у тым ліку і культурным, напрамку, якія яна набыла за гады Савецкай улады. З гэтым нельга не пагадзіцца. На фоне гэтых дасягненняў тым больш цяжкай і недаравальнай выглядае тая трагедыя, якую перажыла на працягу апошніх 30—40 гадоў беларуская мова.**

— Разумею сэнс вашага пытання. Ну, па-першае, чаму ў вылучаным кантэксце мы кранаем толькі апошнія 30—40 гадоў, а не глядзім крыху глыбей? У IV главе нашай працы мы адзначаем, што першыя, падкрэсліваю, першыя ўдары па беларускай мове былі нанесены менавіта яшчэ ў 30-х гадах. Па-першае, у двуякай і супярэчлівай пастанове СНК БССР ад 26 жніўня 1933 г. аб зменах і спрашчэнні беларускага правапісу, дзе, адзначым, абгрунтавана імкнуліся не дапусціць паланізацыі беларускай мовы, разам з тым адмаўляліся некаторыя яго галоўныя рысы і асаблівасці. Па-другое, у выданні на рускай мове газет пасля вызвалення Заходняй Беларусі, дзе нават ва ўмовах польскага часу выходзіла беларуская перыёдыка. Але такое самавольства ажыццяўлялася тады па ініцыятыве рэспубліканскага кіраўніцтва, якое гэтым жадала паказаць сваё рэагаванне на праяўленне беларускага нацыяналізму 20-х гадоў. Дарэчы, аб гэтай з ´яве нацыяналізму 20-х гадоў мы ўдзялілі ўвагу ў IV главе даследавання, асабліва ў яе 2—4 раздзелах. Адзначаем пры гэтым, што здаровая, абгрунтаваная барацьба з нацыяналізмам усюды і заўжды зусім не патрабуе нанясення ўрону сапраўды нацыянальнай культуры. Што тычыцца агульнадзяржаўнай палітыкі СССР таго часу, то яе асновай з ´яўлялася развіццё культуры сацыялістычнай па зместу і нацыянальнай па форме. Вось чаму да Вялікай Айчыннай вайны працягвалі працаваць беларускія школы, у педвучылішчах вялося выкладанне на беларускай мове. Нават ва ўмовах ваеннага часу ў школах, арганізаваных для дзяцей малодшага школьнага ўзросту пры партызанскіх атрадах, выкладанне вялося на беларускай мове. Дарэчы, што тычыцца «лясных школ», то гэта адно з пытанняў, якія я даследаваў у сваёй кандыдацкай дысертацыі. У корані змянілася становішча ў пасляваенныя гады пры М. С. Хрушчове, калі сталі прапаведвацца ілжывыя тэорыі і ідэі аб тым, быццам сапраўдным інтэрнацыяналістам з ´яўляецца толькі той, хто карыстаецца ў першую чаргу і пераважна рускай мовай. Стала расхваляцца і заахвочвацца такая агідная з ´ява, калі некаторыя нацыянальныя пісьменнікі, стварыўшыя свае творы на роднай мове, пачалі яшчэ пісаць і на рускай. Вось адсюль, як кажуць, і пайшло і паехала, ці, чым далей у лес, тым больш дроў, і так амаль да нашых дзён. У кнізе мы падрабязна аналізуем гэты працэс за азначаны час у самых розных напрамках яго «эвалюцыі» і праяўлення.

**— Але ўсё ж, у чым галоўным вызначаецца трагедыя беларускай мовы сёння?**

— У дакладным разуменні гэтага слова да сапраўднай трагедыі беларуская мова не дашла. Нягледзячы на магутныя нігілістычныя перашкоды і супрацьстаянні ў беларускім народзе ўсё ж знайшлося дастаткова здаровых сіл для таго, каб усвядоміць асабістую трагедыю і ўключыцца ў барацьбу за яе пераадоленне. Мабыць не без гэтай падставы ўпершыню афіцыйныя адносіны ЦК КПБ да адмоўных з ´яў, звязанымі з беларускай мовай, былі абнародаваны ў пачатку чэрвеня 1977 г. Вядомым крокам на гэтым шляху з ´явілася стварэнне Таварыства беларускай мовы, старшынёй якога быў абраны Н. С. Гілевіч. Усё гэта прывяло да з ´яўлення акта вялікага гістарычнага значэння: 26 студзеня 1990 г. Вярхоўны Савет прыняў Закон «Аб мовах у Беларускай ССР». Законам беларускай мове нададзены статус дзяржаўнай мовы. Дык вось, сапраўдная трагедыя беларускай мовы магла б адбыцца ў тым, што калі б яна сапраўды загінула, тады загінула б і навука.

**— Прызнаюся адразу, што я з ´яўляюся прыхільнікам дзяржаўнасці толькі беларускай мовы. Інакш яна загубіцца, гэта ж аксіёма. Дык навошта гарадзіць агарод, трэба паступова і паслядоўна навучаць народ роднай мове. Не забываючы, канешне, і пра мовы іншых нацыянальнасцей. Дабіваючыся двухмоў ´я, мы штучна ўносім раскол у грамадства. А як бачыце і ацэньваеце цяпер гэтую праблему Вы, бо ў кнізе выступаеце за двухмоўе?**

— Да праблемы двухмоўя адношуся станоўча. Тым жа Законам прызнана, што «статус беларускай мовы як дзяржаўнай не закранае канстытуцыйных праў грамадзян іншых нацыянальнасцей карыстацца рускай ці іншымі мовамі». Атрымала таксама заканадаўчае прызнанне рэальна існуючае беларуска-рускае двухмоўе. Але тут я хацеў бы вызначыць адно адмоўнае ўздзеянне, якое аказвае на ажыццяўленне Закона «Аб мовах у Беларускай ССР» нацыянал-экстрэмізм, узяўшы курс на супрацьпастаўленне беларускай мове рускай, на ператварэнне беларускай мовы ў зброю сепаратызму і ўшчамленне інтарэсаў іншамоўнага насельніцтва. Нацыянал-экстрэмісты пастаянна выступалі і выступаюць супраць беларуска-рускага двухмоў ´я, імкнучыся «абгрунтаваць» наогул быццам яго «ненатуральнасць» нават фізічнымі асаблівасцямі дзіцяці.

Прыхільнікі такіх поглядаў выказваюць у цалку толькі адмоўныя адносіны да пастановы СНК БССР ад 26 жніўня 1933 г. «Аб змяненнях і спрашчэнні беларускага правапісу». Да гэтага неабходна яшчэ дадаць, што ў 1957 г. у беларускі правапіс былі вярнуты такія яго асноўныя рысы, як падпарадкаванне слоў замежнага паходжання правілам беларускай мовы. У IV главе нават падкрэсліваецца, што, нягледзячы на сур ´ёзныя недахопы пастановы ад 26 жніўня 1933 г., яно было накіравана супраць нацыяналістычнай паланізацыі беларускай мовы. Далейшая практыка паказала, што менавіта гэта частка пастановы СНК БССР выклікала ў сучаных фальсіфікатараў найбольш адмоўную рэакцыю. Яны самі сталі паланізаваць беларускую мову. У іх артыкулах і іншых публікацыях з ´явіліся словы з чыста польскім гучаннем: варункі (па-беларуску «умовы»), стасункі (адносіны) і г. д. У сваіх публікацыях экстрэмісты сталі без усякіх змяненняў ужываць правапіс, існаваўшы да 1933 года. Але вось што цікава — з такім правапісам яны друкуюць не толькі артыкулы, не толькі ў асабістых выданнях, але і ў афіцыйным рэспубліканскім друку. Пры гэтым вельмі дзіўным дуалізме беларускага правапісу (старога і сучаснага) наша афіцыйная лінгвістыка захоўвала алімпійскі спакой. Гэтага антынарматыўнага сваволля не асудзілі ні органы народнай асветы, ні ўстановы Акадэміі навук. Яны не выказалі таксама свае прапановы аб далейшым удасканаленні беларускага правапісу.

Аднак у сучасны мо[illegible] вызначаецца прагрэсіўная тэнд[illegible]цыя гэтага працэсу. У яго далейшым паспяховым развіцці заклікаy ў першую чаргу адыграць сваю станоўчую ролю такі фактар, як безумоўны пераход на рэальнае беларуска-рускае двухмоўе.

Дарэчы, а як дзейнічаюць разумныя палітыкі ў пытаннях мовы ў далёкім замежжы? Яны ці забараняюць, ці фінансуюць, ці даплачваюць, або не даплачваюць. Вось некалькі прыкладаў. У Швейцарыі з насельніцтвам 7 млн. чалавек існуюць чатыры дзяржаўныя мовы — нямецкая, французская, італьянская і старажытна-раманская. У Канадзе (22 млн. чалавек) дзве дзяржаўныя мовы—англійская і французская. У Бельгіі (10 млн. чалавек) дзве дзяржаўныя мовы — фламандская і французская. Прыклады можна прыводзіць і далей. Сярод гэтых прыкладаў пачэснае месца займаў і былы СССР. Але справа не столькі ў колькасці вылучаных прыкладаў, сколькі ў мудрым вырашэнні моўных праблем разважанымі нацыямі і іх палітыкамі. А хіба можна ігнараваць у станоўчым вырашэнні ў Рэспубліцы Беларусь пытання двухмоўя без уліку погляду на гэта беларускага народа? У рэспубліканскім друку, дакладна ў газеце «Советская Белоруссия», неаднаразова друкаваліся (і ні кім не абвяргаліся) вынікі апытання грамадскай думкі, у адпаведнасці з якім больш як 80 працэнтаў беларусаў выказаліся на карысць двух дзяржаўных моў.

У заключэнні я хацеў бы адзначыць, што ў сённяшняй нашай размове я далёка не прэтэндаваў на ролю лінгвіста, мовазнаўцы і г. д. Па закранутых праблемах я выказаў асабістае меркаванне з пазіцыі гісторыка.

**Гутарыў**
**У. АМЕЛЬКА.**

**Ад рэдакцыі: На наш погляд, размова на гэтую тэму заслугоўвае працягу. Бо вывады і ацэнкі, выкладзеныя ў інтэрв ´ю, выходзяць за межы асабістых думак і меркаванняў. Таму мы звяртаемся да чытачоў выказаць свой пункт гледжання на праблему адраджэння беларускай мовы і ў цэлым працэса беларусізацыі. Вашы допісы, нават самыя супрацьлеглыя, будуць апублікаваны.**

## У студэнцкіх аўдыторыях

# АБ ГІСТОРЫІ І ПРА ГІСТОРЫЮ

На днях былі праведзены «круглыя сталы» на тэму, якая, без сумнення, закранае кожнага з нас у большай ці меншай ступені. Гаворка ідзе пра сустрэчы выкладчыкаў і студэнтаў Гродзенскага дзяржуніверсітэта на матэматычным і філалагічным факультэтах, абмеркаваўшы актуальныя праблемы і «белыя плямы» гісторыі Беларусі. Зазначым адразу, што гэта адбылося невыпадкова: ідзе працэс беларусізацыі ў нашай краіне, паўстае многа пытанняў, якія патрабуюць навуковага і аб´ектыўнага асэнсавання, метадалагічна правільных падыходаў да вывучэння беларускай мінуўшчыны, а таксама падзей сённяшняга дня. Рэктарат і Навуковая рада прыняла спецыяльную пастанову на гэты конт (бо, як вядома, не ўсе падзяляюць ацэнкі нашага мінулага, вывады і палажэнні гісторыкаў і публіцыстаў, асабліва на змест і дасягненні сучаснага развіцця беларускага грамадства).

Менавіта таму, адкрываючы сустрэчы, загадчык кафедры гісторыі Беларусі універсітэта прафесар І. П. Крэнь у сваіх выступленнях звярнуў увагу прысутных на сучасны стан беларускай гістарычнай навукі, на тыя захады, якія робяцца па выкрыццю недахопаў і пралікаў у гістарычнай адукацыі і метадалогіі выкладання гісторыі краіны, якая да нядаўняга часу не была, як ні парадаксальна, самастойным прадметам на большасці факультэтаў у ВНУ рэспублікі і тэхнікумах, а заставалася на пасынках, уваходзіла «арганічнай» састаўной часткай гісторыі СССР.

Трэба сказаць, што студэнцкая моладзь зацікаўлена аднеслася да магчымасці высвеліць тое, што па розных прычынах не ў поўнай меры ўдавалася і, на жаль, не зусім удаецца, зрабіць на вучэбных занятках. Тым больш, што ў кожнага з выкладчыкаў ёсць свой падыход да пытанняў і праблем выкладаемага курса, што, зразумела, не пярэчыць сённяшняму этапу грамадскага развіцця. Аб гэтым сведчаць і тыя пытанні, якія прапанавалі «маладыя» «старэйшым».

Каб чытач меў уяўленне аб характары і зместу іх, мы прывядзём толькі найбольш паказальныя з іх. Студэнты філалагічнага факультэта сканцэнтравалі сваю ўвагу на наступным: «Ці поўнасцю страціла Вялікае княства Літоўскае дзяржаўнасць пасля Люблінскай уніі?»; «Як Вы ставіцеся да праграмы БНР, сённяшняга БНФ і ПКБ?»; «Ці можна лічыць Статут ВКЛ і яго змест першай беларускай канстытуцыяй?»; «Асаблівасці акупацыйнага рэжыму на тэрыторыі Беларусі ў перыяд Вялікай Айчыннай вайны 1941—1945 гадоў»; «Якія святы павінны адзначаць беларусы?»; «Рэпрэсіі 30-х гадоў 20-га стагоддзя на Беларусі» і інш.

Матэматыкаў цікавілі пытанні наступнага зместу: «Як з´явіўся і адкуль наш беларускі сцяг?» (зазначым адразу, што на розных факультэтах тэрмін выкладаемага курсу розны і не ўсе тэмы даюцца па аднаму раскладу, што і адлюстроўвалася ў характары цікавячых пытанняў — У. Я., Т. Л.); «Як Вы адносіцеся да таго, што Вільня, былая сталіца беларусаў, не належыць да Беларусі?; «Што можна сказаць пра партыю БУНД, якая мела вялікі ўплыў на насельніцтва Беларусі?»; «Дзяржаўная мова: руская ці беларуская, лёс апошняй у нашым жыцці?»; «Падзеі Кастрычніка 1917 года: рэвалюцыя ці пераварот?»; «Падзеі 1939 года і іх уплыў на развіццё беларускага грамадства», і нават такія: «Якія партыйцы маюць перавагу сярод выкладчыкаў універсітэта: БНФ ці ПКБ?», «Навошта Беларусі незалежнасць і абасабленне? Вядома ж, што працэс дэзінтэграцыі ёсць рэгрэсіўны? (падпісана — «група таварышаў з матфака»).

Нам уяўляецца, што такі расклад думак і меркаванняў ёсць яскравае адлюстраванне таго перыяду развіцця нашай Айчыны, які мы ўсе перажываем. Больш таго, мы схільны лічыць, што гэта таксама і пэўныя парасткі той свядомасці, якая сёння ўласціва нашым выхаванцам. Нічога крамольнага тут няма. Гэта заканамерны працэс.

Але ж нельга не адзначыць і тое, што сённяшні стан навуковай базы нашай гістарычнай адукацыі не можа поўнасцю задаволіць тым патрабаванням, якія на сёння, ізноў жа, патрэбны. На жаль, здаецца, што і ў наш час «гісторыя задзірае спадніцу перад палітыкай».

Вядома, што якасць выкладання любога прадмету вызначаюць людзі падрыхтаваныя не толькі навукова, але і сапраўдныя педагогі. Праведзенае мерапрыемства паказала, што калектыў кафедры гісторыі Беларусі здольны вырашаць ускладзеныя на яго функцыі. Не перабольшваючы, а тым больш і не перахвальваючы сваіх калег, хацелі б выказаць вялікую падзяку нашым вядучым выкладчыкам — Крэню І. П., Коўкелю І. І., Нядзельку У. А., Фёдараву І. А., Сяльверставай С. Я., Бярэйшык Л. У., Іванчуку Б. М. і іншым удзельнікам сустрэч, якія, па выказаных думках студэнтаў нашай ВНУ, заслужылі падзяку і словы ўдзячнасці за высокі ўзровень навуковай падрыхтоўкі, інтэлект і павагу да «дамагаючыхся»... Спадзяёмся, што і мы дзесьці сярод іх...

Р. С. «Круглыя сталы» на гэтым не спыняюцца.

**У. Ягорычаў,**
**Т. Лугачова,**
**кандыдаты гістарычных навук, дацэнты.**



# У ТОЙ ПАМЯТНЫ РАНАК...

**Гэты матэрыял прынёс у рэдакцыю супрацоўнік кафедры квантавай электронікі, нештатны фотакарэспандэнт нашай газеты Уладзімір Ігнатавіч Сарокін і сказаў: «Набліжаецца 50-годдзе вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Мой бацька — адзін з яго ўдзельнікаў. Яго ўспаміны пра тыя памятныя дні 44-га запомніліся мне. Да таго ж у яго расказе сустрэчы на франтавых дарогах з вядомымі на Беларусі людзьмі. Надрукуйце, хай моладзь ведае».**

**Прапануем вашай увазе франтавыя заметкі ўдзельніка вызвалення роднай Бацькаўшчыны.**

Эх, дарогі... Нехта ў першай калоне ціха зацягнуў знаёмую песню, і лясная прасека насцярожана, як успуджаная пташка, адгукнулася рэхам хуткіх, дружных салдацкіх крокаў. На ўскраіне старога бору зрабілі кароткі прывал. А разам з тым і выслалі наперад групу разведчыкаў, каб добра ведаць становішча вакол Чэрвеня.

— Якая прыгожая назва — Чэрвень! — заўважыў камбат Глазуноў, зварочваючы палявую карту.

— Мабыць, зараз вып´ем вадзіцы з чыстай крыніцы.

Ён зайшоў ззаду мяне і, прысеўшы на смаляны пянёк, з гумарам сказаў: «Пацясніўся б, ці што, таварыш ротны. Паглядзі, які кругляш акупіраваў».

Мы сядзелі спіной да спіны. Яркі дзень выпалосквaў высокія сосны летняй спякотай, быццам медзю абліваючы тугія, моцныя ствалы зверху данізу. У такія хвіліны ўсе думкі аб адным: ці не дажывем да цішыні, якая бывае, калі па лясной дарозе з кашолкай наперавес зойдзеш у лясны гушчар... Толькі івалга кліча жалобна, кліча да сябе з густога зялёнага шапацення...

— Што змоўк? Заслухаўся пяюхай?..— Камбат азірнуўся да мяне і маладцавата ўсміхнуўся.

— А як жа не заслухацца,— кажу.— Гэта роднае, мілае. Душу кране за жывое.

Раптам пачуўся голас адтуль, з супрацьлеглага боку паляны: — Дзе наш камбат? Да яго госці.

— Што яшчэ за госці? — Глазуноў хутка крочыў направа, асыпаючы часты ядловец.— Я нікога не запрашаў.

— Вось яны, таварыш камбат. Усе ў наяўнасці.— Сяржант Іваноў узяў пад казырок і застыў у чаканні камандзіра.

Цеснай групай стаялі людзі рознага ўзросту: хто з барадой, хто зусім юны. Гэта былі партызаны, як мы даведаліся, з атрада «Полымя».

— А, лясныя салдаты... Якім лёсам да нас? — Камбат прыжмурыў вочы ад сонца, якое сляпіла вочы, і прывітаўся з кожным за руку.

— Рады гасцям. Рады.. А старэйшы хто сярод вас?

Юнак з вострым позіркам выйшаў крыху наперад.

— Іван Пятроўскі — намеснік, а камандзір — Аляксандр Адамовіч,— сказаў ён,— камсамольскі важак атрада.

— Цудоўна, вельмі своечасова вы да нас падаспелі.

Глазуноў прысеў на кукішкі, выбіраючы сухое месца.

— Рабі, як я. І ён сеў у сакавітую, густую траву. За ім — усе, хто быў побач.

— Тутэйшыя месцы вам добра знаёмы. Што ад вас патрабуецца? Непрыкметна перакінуць

## Да 50-годдзя вызвалення Беларусі

адсюль авангард на тэрыторыю горада. Паўтараю, скрытна. Гэта патрэбна зрабіць, каб ніводная нямецкая душа не заўважыла нашай перакідкі. Інакш мы ўспудзім іх абарону, і тады Чэрвень пакажа нам вострыя рогі.

Пятроўскі і Адамовіч паказалі камбату на карце праходы і слабыя месцы ў нямецкай абароне.

Так, камсамольскі важак і намеснік, я на вас спадзяваюся!

Глазуноў схаваў карту ў планшэт, адклікаў у бок мяне і Пятроўскага.

— Сарокін, возьмеш з сабою сваю роту і ў абход горада. Будзеце ісці, як дамовіліся. Апорная кропка — бальніца. Сігнал — адзіночная ракета. Чырвоная, зразумела? А зараз, як робіцца на Русі, званы абед. Прашу... госці, наперад. Трэба падмацавацца. Я так разумею.

Мы частавалі партызан чым маглі. Нехта нават заўважыў:

— Пры такой садружнасці кругавая абарона вытрымае любы націск.

Калі я азірнуўся, Адамовіч засаромлена дадаў:

— Дадам... любы дадатковы ўдар пры кругавой абароне нам не страшны...

Ён, дарэчы, ужо тады быў закаханы ў механіку, фізіку і літаратуру. І нягледзячы на цяжкае становішча, ужо тады знаходзіў час, каб зазірнуць у свае паходныя блакноты і ўзварухнуць веды па фізіцы і літаратуры вельмі сур´ёзна.

Мы затаіліся, памятаю, у самым тупіку балота, каб перачакаць, пакуль тры нямецкія бронемашыны пройдуць праз роў.

Маўчым. Ні слова. Ні шораху. А ён прыхіліўся да сасны і ўжо нешта падлічвае.

— Задачку мучыш? — пытаюся ціха.

— Крыху не адгадаў — усміўнуўся ён. Формулу адну ўспомніў. А вынік — як у ваду кануў.

— Нічога, кажу,— адгрыміць вайна, на ясную галаву ўсё прыгадаецца. Як ёсць усё: і формулы, і законы, і Янку Купалу прыгадаем. Толькі не губляй надзеі.

Хударлявы твар юнака выдаваў у ім мяккі даверлівы характар.

— Кідай сваю гармату, камсамольскі важак,— нехта з партызан маўнуў рукой.— Пайшлі...

— Што значыць кідай? — засмуціўся ён, хаваючы блакнот у кішэню, за пазуху.— Так толькі ў карнай экспедыцыі гавораць, а тут — яе вялікасць навука.

Мы ішлі пару кіламетраў рука аб руку з ім. Нарэшце з´явіўся будынак бальніцы. Далей трэба было прабівацца паўзком. Каля будынка, на шчасце, не было ніводнага варожага паста. Толькі мы прайшлі ў двор, як зараз жа сустрэліся з жанчынамі.

— Прыйшлі, родныя! Радасць якая, бацюшкі,— прагучала вакол нас.

— Ціха, мамаша, бо немцы вакол,— кажу я ёй. А яна сваё:

— Я вам вадзіцы прынясу, піце на здароўе. (Як я потым даведаўся, гэта была Анастасія Фёдараўна Лісіца, якая жыве ў Чэрвені і цяпер).

Мы размясціліся каля будынка бальніцы, паставілі кулямёты.

— Рабяты, да бою! — падаў я каманду, і ракета плаўна акрэсліла дугу. Раптам затрашчалі кулямёты. Фашысты ніяк не спадзяваліся, што да іх «за пазуху» закрадзецца руская кемлівасць, і пачалі адступаць. За горадам няпрошаных гасцей сустракалі нашы байцы.

Аперацыя па вызваленню Чэрвеня была выканана, мы таксама выканалі сваё заданне.

На жаль, пасля гэтага боя нам давялося растацца з гэтымі хлопцамі з партызанскага атрада. І ніхто яшчэ не ведаў у той дзень, што па вуліцах вызваленага горада ішлі не проста юнакі з партызанскага атрада «Полымя», а будучыя вучоныя: фізік Пятроўскі. літаратар Адамовіч, якіх ведае зараз ўся рэспубліка, іх родная Беларусь.

**І. САРОКІН,**
**удзельнік вызвалення Беларусі, жыхар г. Гродна.**



**Ва універсітэце вялікая ўвага надаецца праходжанню практыкі ў школах. У час яе студэнты знаёмяцца з вучнёўскімі калектывамі, засвойваюць веды, атрыманыя на занятках.**

**Большасць практыкантаў сумленна адносяцца да сваіх абавязкаў: рэгулярна бываюць на ўроках, пад кіраўніцтвам настаўнікаў праводзяць заняткі, пазакласныя мерапрыемствы.**

**Вось і нядаўна ў Гродзенскай школе-гімназіі № 30 праходзілі практыку студэнты філалагічнага факультэта. Там засталіся імі задаволены.**

**На здымку: у час педпрактыкі ў школе-гімназіі.**

**Фота У. САРОКІНА.**



Я сама! Фота А. КАЛАДЗІНСКАГА.

## І гэта ўсё аб іх

# Пра пятуха ў год Пятуха

Пятух прыкаціў на птушыны двор яйцо страуса, сабраў кур і сказаў прамову:

— Мілыя дамы,— сказаў ён.— Я нікога не бяруся крытыкаваць, але ўсё ж, як працуюць за мяжой!

***

— Паслухай, Мэры,— гаворыць фермер сваёй жонцы,— мне здаецца, што белы пятух штосьці засумаваў. Ці не зварыць з яго бульён?

— Ну, калі ты спадзяешся яго гэтым развесяліць, то давай.

***

— Пятух ускочыў на абедзены стол і ўбачыў падсмажанага пятуха пад соусам з белага віна.

— Цяпер я бачу, што гэта праўда! — дрыжачым голасам усклікнуў ён.— Алкаголь сапраўды забівае.

***

На базары.

— Скажыце, чым вы кармілі свайго пятуха?

— А чаму вас гэта цікавіць?

— Я хацела б таксама так пахудзець...

***

На базары грузін прадае пятуха. Падыходзіць да яго пакупнік, пытаецца.

— Колькі каштуе пятух і ці шчыпае ён кур?

— Тысячу рублёў. А што такое шчыпае?

— Пакупнік развярнуўся і пайшоў.

Незадаволены грузін пытае ў бабкі, якая гандлявала курамі:

— Бабуля, а што такое «шчыпае»? Калі зразумеў, пачаў крычаць на ўвесь базар:

— Прадаецца пятух! Тысяча рублёў! Курэй шчыпае, гусь шчыпае, індык шчыпае... На жонку вока паклаў. Прадаю!

***

Кураня б´еццa галавой аб сцяну і крычыць:

— Сорам! Сорам!

Падыходзіць курыца.

— Мама, а гэта праўда, што мой бацька-пятух?

— Канешне, сынок.

— Сорам! Божа, які сорам.

***

Госць усхвалявана гаворыць гаспадыні.

— Ваш пятух неяк коса глядзіць на мяне.

— Не звяртайце ўвагі. Ён заўсёды так глядзіць на таго, хто есць з яго міскі.

***

Ляжаць два пятухі на прылаўку: савецкі і імпартны. Закардонны хваліцца:

— Які я тлусценькі, якая ўпакоўка прыгожанькая!

Наш не вытрымаў:

— Затое я сваёй смерцю памёр!

***

Едзе мужык вечарам на машыне, раптам у святле фар убачыў бягучага пятуха, ён прыбавіў газу, пятух бяжыць уперадзе, раптам ён павярнуў і забег на птушкаферму. Мужык вылез з машыны і падыйшоў да стоража.

— Што ў вас за пятух такі?

— Ды новую пароду вывялі.

— Ну і як, мяса смачнае?

— А хто яго ведае! Да гэтай пары зловіць не могуць.

***

Пятух падаў заяву ў музычную школу.

— Навошта табе вучыцца? — спытаў салавей.— Ты і так добра спяваеш.

— Я і сам гэта ведаю,— адказаў пятух,— але курыцы патрабуюць дыплом.

**З калекцыі Юрыя ШАСТАКА.**

**1994 год — год Сабакі. Даем невялікую характарыстыку Сабакі.**

# Што Сабака нам прынясе?

Сабака народжана пад знакамі вернасці і клопатаў і звычайна прытрымліваецца цвёрдых поглядаў і думак і нічога не робіць без прычыны. Ёй не падабаецца несправядлівасць, безсумленнасць, яна здольна аддаць апошнюю капейку, каб дапамагчы таму, хто ў чым-небудзь мае патрэбу. Сабака вельмі прамалінейна і, як правіла, выказваецца прама і па сутнасці. Яна бывае даволі ўпартай, але заўсёды гатова выслухаць думку другога і імкнецца да аб´ектыўнасці ў сваіх учынках і рашэннях. Яна з задавальненнем дапаможа парадай, але толькі тады, калі аб гэтым папросяць, а ў цяжкую хвіліну першай працягне руку дапамогі.

Нягледзячы на дружалюбны характар, Сабака не вельмі кантактны, не любіць шумных зборышчаў і прыёмаў, а любіць спакойную інтымную абстаноўку. Яна — цудоўны субяседнік.

Сабака надзейная і верная, але калі адчуе да сябе негатыўныя адносіны або пагарду, то ніколі не забудзе і не даруе гэтага.

Сабака не схільна да збіральніцтва і не асабліва імкнецца да матэрыяльнага дабрабыту.

Сабака не адчувае недахопу ў сябрах і аднадумцах, але жыць з ёю не проста. У яе часта мяняецца настрой, яна прад´яўляе надта высокія патрабаванні, але ў адносінах да сябра або партнёра аддана ўсёй душой. Лепш за ўсё у яе могуць скласціся адносіны з народжанымі пад знакамі Каня, Свінні, Тыгра і Малпы. Дракон занадта імпульсіўны для Сабакі. Цяжка знайсці агульную мову з даволі рухавай і дзейснай Казой, а востры на язык Пятух выклікае раздражненне. Сабака-дама славіцца прыгажосцю, мае мяккі, клапатлівы характар, яна вельмі разумная, любіць спорт і вядзе рухомы лад жыцця.

Сабакі, як правіла, добра ладзяць з дзецьмі і звычайна бываюць любячымі і клапатлівымі бацькамі.

# З назіранняў Дзеда Мароза

Напярэдадні Новага года многія адчуваюць своеасаблівы пагранічны стан сваёй асобы. Кожны, у каго жыве надзея на лепшае, шчыра імкнецца выкарыстаць урачыстую фармальнасць змены календароў для таго, каб прыйсці ў новае вымярэнне жыцця абноўленым.

У традыцыях навагодняга абраду клятвы і абяцанні.

Дзеці і бюракраты ў які раз абяцаюць, што яны больш не будуць...

Жанчыны востра адчуваюць сваю прыналежнасць да зоркавай сферы і ліхаманкава гартаюць ксераксныя гараскопы, спрабуючы даведацца — што надыходзячы год ім рыхтуе...

Публіка больш практычная ганяецца за календарамі Знешгандлю, якія адрозніваюцца палепшанай паліграфічнай якасцю, за часопісамі мод і самымі праверанымі плёткамі аб цэнах на прадукты...

Рэдакцыі газет і часопісаў, у тым ліку і самыя сур´ёзныя, дазваляюць сабе выбраць да канца ліміт гумару і пачынаюць друкаваць псіхалагічныя тэсты, імкнучыся парадаваць чытача, які ліхаманкава шукае сваё «я» узору будучага года.

Трэба быць вельмі змрочным чалавекам, каб без разумення аднесціся да ўсёй гэтай мітусні. Больш таго, не патрабуецца асаблівай пранікнёнасці, каб убачыць пэўную карысць, якую прыносяць чалавеку такія заняткі. Прага абнаўлення — моцны матыў, і да яго варта аднесціся з павагай.

## Навіны спорту

# Добрыя старты

Чытачам газеты вядома, што спартсмены-барцы нашага універсітэта паспяхова выступаюць на прэстыжных спартыўных форумах. І апошнія месяцы года не сталі выключэннем.

У міжнародным турніры па грэка-рымскай барацьбе прымалі ўдзел студэнты нашага універсітэта: Жук Віталій, Сідарэнка Аляксандр, Пяўцоў Ігар. Вельмі ганарова, што ў спаборніцтвах прымалі ўдзел 14 каманд, а нашы барцы занялі 1 месца і атрымалі медалі, кубкі і грашовыя прэміі.

У міжнародных спаборніцтвах па грэка-рымскай барацьбе ў Санкт-Пецярбурзе на прыз 2-га мемарыяла прафесара Ю. А. Лаўрыкава вызначыўся Цыленць Валерый (1 месца), якога ўзнагародзілі прызам лепшага барца турніра і магнітафонам.

Адбыліся спартыўныя спаборніцтвы універсітэта па шахматах. Вось якія атрымаліся вынікі: на 1 дошцы пераможцам стаў Бекіш Ігар (фізічны факультэт), на 2-й — Коўкель Уладзімір (матэматычны), на 3-й — Рудакоў Дзмітрый (матэматычны) і на 4-й — Гапонік Наталля (факультэт правазнаўства).

У першынстве універсітэта па плаванню пераможцам сярод факультэтаў стаў факультэт правазнаўства, на 2-м месцы — матэматычны, на 3-м — гістарычны факультэт.

**У асабістай спрэчцы** на воднай лініі на 100 м вольным стылем сталі:

**сярод дзяўчат** — 1 месца — Кішкель Ганна (матэматычны факультэт, яе час — 1.14.2), 2 месца — Ярома Вольга (біялагічны з часам — 1.14.7) і 3 месца — Ляшкевіч Вера (факультэт правазнаўства, 1.15.0);

**сярод юнакоў** — самым хуткім у плаванні аказаўся Тупік Дзмітрый (фізічны факультэт, 0.55.6), крыху не дагнаў сябра Гелейша Дзмітрый (фізічны, 0.55.8), на 3-ю ступеньку п´едэстала ўзняўся Цялегін Андрэй (факультэт правазнаўства, 0.58.2).

У камандный эстафеце 4х50 вольным стылем атрымаў перамогу факультэт правазнаўства, на 2-м месцы — гістарычны факультэт, бронзавы медаль у фізічнага факультэта.

# Свята грацыі і прыгажосці

Спартыўная гімнастыка — каралева прыгажосці, рухаў, грацыі, эмоцый. У мінулую сераду першакурсніцы васьмі факультэтаў падаравалі нам гэтае свята. Было ўсё: і парад адкрыцця з гімнамі і сцягамі, і прывітанне акадэміка А. І. Яроцкага, і слёзы радасці, і вострая бескампрамісная барацьба. Да самай апошняй хвіліны нельга было сказаць аб пераможцы ў камандным першынстве, бо гімнасткі чатырох факультэтаў ішлі ўпоравень, але ўсё-такі будучыя юрысты, праявіўшы вытрымку і дакладнасць выступлення ў апошнім відзе спаборніцтваў сталі пераможцамі.

Вось як выглядае турнірная табліца.

**Каманднае першынство**

1 месца — факультэт правазнаўства — 396,7 бала,

2 месца — біяфак (391,0 бала),

3 месца — філфак (386,7 бала).

Гістарычны факультэт — 384,5 бала, факультэт методыкі пачатковага навучання — 383,2, факультэт беларускай філалогіі і культуры — 381,4 матфак — 374,3, аддзяленне міжнародных эканамічных адносін — 374,2 бала.

**Асабістае першынство** (шматбор´е)

1 месца — Надзея Траццякова — біяфак — 46,5 бала,

2 месца — Юлія Пакубята — факультэт правазнаўства — 46,4 бала,

3 месца — Ала Раманоўская — гістфак — 45,2 бала.

Пераможцамі ў асобных відах сталі Надзея Траццякова (практыкаванні на бруссях і ў акрабатыцы) і Юлія Пакубята (апорны скачок і вольныя практыкаванні).

**О. СМАЛЯКОЎ,**
**галоўны суддзя спаборніцтваў, суддзя вышэйшай нацыянальнай катэгорыі, старшы выкладчык кафедры фізвыхавання.**


Наш адрас: 230023, г. Гродна, вул. Ажэшкі, 22, пакой 404, тэл. 44-72-97

Газета выходзіць два разы на месяц. Аб´ём газеты — адзін друкаваны аркуш

Зак. 5639

Тыр. 1000 экз.

Газета надрукавана афсетным способам у Гродзенскай абласной узбуйненай друкарні г. Гродна, вул. Паліграфістаў, 4. Падпісана ў друк у 15.00.

Рэгістрацыйнае пасведчанне 421

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: ВУЧОНАЯ РАДА УНІВЕРСІТЭТА, ПРАФКАМ СУПРАЦОЎНІКАЎ, ПРАФКАМ СТУДЭНТАЎ

В. а. рэдактара У. П. АМЕЛЬКА